8. Полонська-Василенко Н. Історія України У 2-х т. Т. 1 До середини XVII ст./ Н. Полонська-Василенко. – К.: Либідь, 1995. – 672 с.
9. Степанов Д.Ю. «Русское», «Малороссийское» и «Московское» в представлениях элиты Гетманщины в 50-60-е гг. XVII в./ Д.Ю. Степанов// Славяноведение. – 2012. – № 4. – С. 12-21.

Курдзюк В. М.
БДУ (Мінск)

## Шлюбная стратэгія Гедымінавічаў у адносінах да Цвярскога княства ў XIV – першай трэці XV стст.

У пачатку XIV ст. тэрыторыя Паўночна-Усходняй Русі ўсё яшчэ знаходзілася ў васальнай залежнасці ад Залатой Арды. Але ў гэты час ужо вызначыліся два мацнейшыя княствы – Цвярское і Маскоўскае, кожнае з якіх жадала стаць цэнтрам аб'яднання “рускіх” зямель [1, с. 73]. Паміж Цвер'ю і Масквой ішла барацьба за вярхоўную ўладу ў Паўночна-Усходняй Русі, якая была непасрэдна звязана з валоданнем ярлыка на ўладзімірскае княжанне.

Ужо ў 1317 г. перавагу ў барацьбе за вялікае княжанне атрымала Масква, паколькі хан вырашыў даць ярлык князю Юрыю Данілавічу. Слабейшаму на той час Цвярскому княству патрабаваўся моцны саюзнік у барацьбе з Маскоўскім княствам за землі Паўночна-Усходняй Русі. І на гэтую ролю вельмі добра падыходзіла Вялікае Княства Літоўскае. У сваю чаргу, Літва, як і Масква, жадала пашырыць свой уплыў на Пскоўскія і Наўгародскія землі. Таму вялікі князь літоўскі Гедымін (1316–1341 гг.) таксама быў зацікаўлены ў падтрымцы Цверы. У выніку, паміж прадстаўнікамі кіруючых дынастый абедзвюх дзяржаў быў заключаны шлюб, які паклаў пачатак саюзных адносін ВКЛ з Цвер'ю. І гэты стратэгічны саюз праіснаваў даволі доўгі час – больш за 100 год [1, с. 73].

Мэтай дадзенай працы з'яўляецца аналіз дынастычных сувязяў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Цвярскім княствам і іх уплыву на палітыку вялікіх князёў літоўскіх па “збіранні” зямель Русі.

Зімой 1319–1320 гг. быў заключаны шлюб Марыі Гедымінаўны з цвярскім князем Дзмітрыем Міхайлавічам Грозныя Вочы, бацьку якога ў



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

лістападзе 1318 г. забілі ў Ардзе [4, с. 28]. Міхаіл Яраславіч ужо з пачатку XIV ст. уступіў у барацьбу за ўладзімірскае княжанне з Юрыем Данілавічам Маскоўскім. Пасля смерці Міхаіла Цвярское княства было падзелена паміж яго чатырма сынамі, у Цвяры сеў старэйшы з іх Дзмітрый. Ужо ў 1322 г. ён атрымаў ярлык на ўладзімірскае княжанне. Але поспех быў кароткі, праз чатыры гады Дзмітрый Міхайлавіч быў забіты ў Ардзе. Ярлык на ўладзімірскае княжанне атрымаў брат Дзмітрыя Міхайлавіча Аляксандр [2, с. 139].

Шлюб Марыі і Дзмітрыя Грозныя Вочы меў выключна палітычны характар. Пасля смерці Міхаіла Яраславіча паміж яго сынамі пачалася барацьба за велікакняжацкую ўладу. Дзеля замацавання больш трывалага становішча браты пачалі заключаць шлюбы і, такім чынам, шукаць падтрымкі ў суседніх княствах. Першы ажаніўся Канстанцін Міхайлавіч на дачцэ маскоўскага князя Юрыя Данілавіча, за ім шлюб заключыў Аляксандр з прадстаўніцай княжацкага роду з Галіцка-Валынскага княства, а потым і Дзмітрый Міхайлавіч. Такім чынам, праз шлюб Дзмітрый заручыўся падтрымкай Вялікага Княства Літоўскага не толькі ў барацьбе за ўладу ў Цвярскім княстве, але і супраць маскоўскіх князёў, якія былі галоўнымі канкурэнтамі ў барацьбе за палітычную гегемонію на Русі. У 1322 г. Дзмітрый Міхайлавіч атрымаў ярлык на ўладзімірскае княжанне, аднак ужо ў 1326 г. быў забіты ў Ардзе.

Шлюб Дзмітрыя Міхайлавіча з Марыяй меў свае станоўчыя вынікі. Цвер стала надзейным саюзнікам для Літвы ў супрацьстаянні ўзвышэнню Масквы. Нягледзячы на тое, што мужа Марыі ў хуткім часе забілі ў Ардзе, гэта не прывяло да разрыву саюзных адносін. Гедымін падтрымліваў брата Дзмітрыя Аляксандра Міхайлавіча ў барацьбе за ўладзімірскае княжанне. Пасля паўстання 1327 г. цвярскі князь змог знайсці прытулак на тэрыторыі ВКЛ. У 1331 г. пад уплывам вялікага князя Гедыміна пскавічане прынялі да сябе на княжанне Аляксандра Міхайлавіча, які сядзеў тут на працягу шасці год [1, с. 73-74]. У выніку і Арда, і Вялікае Княства Літоўскае ўмешваліся ва ўнутраную барацьбу паміж двума цэнтрамі раздробленай Русі.

У 1349 г. Вялікае Княства Літоўскае прайграла дыпламатычную вайну супраць Маскоўскага княства. Пасля няўдалых перамоў у Ардзе,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

мэтай якіх быў дагавор аб дапамозе ў барацьбе з маскоўскім князем, Карыят Гедымінавіч са сваім сынам трапілі ў палон да Сімяона Гордага. Дзеля вызвалення сваіх родзічаў вялікі князь Альгерд (1345-1377 гг.) адмовіўся ад прэтэнзій на Вярхоўскія княствы. Палонныя былі адпушчаны. У сваю чаргу літоўскі князь прасіў дазвола ў Сімяона Гордага на шлюб з княжной з цвярской лініі Рурыкавічаў Ульянай, сястрой жонкі маскоўскага князя, які адбыўся ў 1350 г. [4, с. 31]. Верагодна, што заключэнне гэтага шлюбу, які быў першы пасля шлюбу Марыі Гедымінаўны з Дзмітрыем Грозныя Вочы, стаіць ля вытокаў замацавання больш цесных сувязей паміж Аляксандравічамі і Альгердам [3, с. 167]. Магчыма, адной з прычын шлюбу Альгерда з'яўляецца барацьба за галіцка-валынскую спадчыну. Верагодна, менавіта па гэтай прычыне Гедымінавічы імкнуліся заключаць дынастычныя сувязі з рускімі князямі і шукалі іх падрымкі. Праз шлюб з Ульянай Альгерд змог зблізіцца як з Цвярскім княствам, так і з Маскоўскім.

Шлюб Альгерда і Ульяны Цвярской мае некалькі мэт. Сюды можна аднесці як спосаб замацавання дамовы, так і пошук саюзнікаў з боку ВКЛ. Але галоўным чынам праз гэты шлюб усталёўваліся больш цесныя сувязі паміж Літвой з аднаго боку, Масквой і Цвер'ю - з другога.

Значную ролю ВКЛ адыграла ў барацьбе паміж Цвер'ю і Масквой пасля смерці цвярскога князя Васіля Міхайлавіча. Уладу ўзяў Міхаіл Аляксандравіч, але маскоўскаму князю гэта не спадабалася і ён адправіў войска на Цвярское княства. Міхаіл Аляксандравіч збег да свайго зяця ў Літву і прасіў падтрымкі ў Альгерда, верагодна, на гэта паўплывала і Ульяна Цвярская. У выніку гэта вылілася ў тры паходы Альгерда на Маскву 1368, 1370 і 1372 гг. Такім чынам, адзначаецца ўжо і ваенная патрымка з боку ВКЛ у барацьбе паміж Цвер'ю і Масквой, што дазваляе нам казаць аб замацаванні саюзных адносін паміж Літвой і Цвярскім княствам.

Такім чынам, пачынае закладвацца традыцыйнае заключэнне шлюбаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Цвярскім княствам. Надалей шлюбы звычайна ўзмацнялі саюзніцкія адносіны гэтых княстваў, выступалі гарантамі саюза гэтых дзяржаў.



This document has been edited with Infix PDF Editor
- free for non-commercial use.
To remove this notice, visit:
www.iceni.com/unlock.htm

У 1375 г. маскоўскі князь Дзмітрый здейсніў паход на Цвер, якая ў той момант не атрымала ніякай падтрымкі ад сваіх саюзнікаў. У выніку цвярскі князь быў вымушаны прызнаць сябе “малодшым братам” Дзмітрыя Маскоўскага і заключыць з ім антыардынскі саюз. Цвярскі князь таксама павінен быў разарваць сувязі з Літвой, але Міхаіл не збіраўся выконваць гэтую ўмову. У 1375 г. быў заключаны чарговы шлюб паміж дачкой Кейстута Міклоўсай (Марыяй) і Іванам Міхайлавічам (часам называюць 1374 і 1377 гг.) [3, с. 214]. У выніку шлюба Міклоўсы і Івана Міхайлавіча нарадзіліся тры сыны: Аляксандр, Іван і Юрый. Перад смерцю дачка Кейстута прыняла пострыг пад іменем Марыя і памерла 30 кастрычніка 1405 г. Яе муж ажаніўся паўторна ў 1408 г. на дачцэ дарагабужскага князя Дзмітрыя Ерэмеевіча Еўдакіі, але нашчадкаў у іх не было [6, с. 219].

Ужо пасля смерці Альгерда ў 1377 г. адзначаюцца змены ў адносінах паміж Цвер’ю і Літвой. Часткова гэта было звязана са змяншэннем магчымасцей Цвярскога княства супрацоўнічаць з ВКЛ. Але галоўную ролю тут адыграла ўнутрапалітычнае становішча ў самой Літве. Тут пачалася грамадзянская вайна паміж Кейстутам і Ягайлам. Пасля таго, як апошні ажаніўся з Ядвігай, стаў польскім каралём і прыняў каталіцтва, Цвер ужо не бачыла ранейшых перспектыў сваёй палітыкі ў адносінах да ВКЛ.

Наступны шлюб з цвярской дынастыяй быў заключаны ў 1384 г. Дачка кіеўскага князя Уладзіміра Альгердавіча стала жонкай цвярскога князя Васіля Міхайлавіча. Некаторыя навукоўцы называюць яе Анастасіяй, але не ўсе згодны з гэтым меркаваннем [6, с. 84]. Верагодна, значны ўплыў на заключэнне дадзенага шлюбу аказала Ульяна Цвярская. Уладзімір быў сынам Альгерда ад першага шлюбу з Марыяй Віцебскай, але ў той жа час меў добрыя стасункі са сваёй мачахай. Апошнія свае гады Ульяна правяла ў Кіеве, дзе і памерла. Такім чынам, Уладзімір яшчэ больш парадніўся са сваёй мачахай, выдаўшы сваю дачку Анастасію за пляменніка Ульяны князя Васіля.

У 1396 г. Васіль Міхайлавіч аўдавеў, аднак хутка заключыў наступны шлюб зноў з прадстаўніцай Альгердавічаў – Анастасіяй Карыбутаўнай [6, с. 84]. Дакладная дата шлюбу невядома. Аднак вядома,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

што ўжо ў 1400 г. нарадзіўся сын Васіля і Анастасіі Дзмітрый. З гэтага вынікае, што дадзены шлюб быў заключаны ў прамежку паміж 1396–1399 гг. Трэба таксама адзначыць і той момант, што Васіль і Анастасія Карыбутаўна былі кроўнымі родзічамі (Васіль прыходзіўся пляменнікам Ульяне Цвярской, а Анастасія была яе ўнучкай). Як і ў выпадку з папярэднімі шлюбамі, галоўнай мэтай было – гэта замацаванне сувязей з Цвярскім княствам.

Дынастычныя сувязі Цвяры з Літвой гублялі ранейшы антымаскоўскі характар, хутчэй выступаючы ў якасці існуючай традыцыі. Цвярскі князь імкнуўся не дапусціць разрыву сувязей са сваім саюзнікам – ВКЛ.

Самым малодшым сынам Альгерда быў Свідрыгайла, які нарадзіўся ў 1373 г. У апошні час пануе меркаванне аб двух шлюбах Свідрыгайлы: першы быў заключаны з дачкой смаленскага князя Юрыя Святаславіча, а другі – з цвярской княжной Ганнай. Апошняя была дачкой цвярскога князя Івана Іванавіча, а таксама стрыечнай сястрой цвярскога вялікага князя Барыса Аляксандравіча. Атрымалася так, што Свідрыгайла быў сваяком Ганне як па бацькоўскай, так і па матчынай лініі. Дзед Ганны вялікі князь Іван Міхайлавіч быў пляменнікам маці Свідрыгайлы Ульяны Цвярской і быў жанаты на Марыі Кейстутаўне, якая з’яўлялася стрыечнай сястрой Свідрыгайле. Шлюб Ганны і Свідрыгайлы быў заключаны не пазней за 9 лістапада 1430 г., але і не раней за 29 снежня 1431 г. [5, с. 252]. Трэба адзначыць, што Э. Клюг называе дату гэтага шлюбу 1431-1432 гг. і бачыць у ім сувязь з барацьбой супраць Жыгімонта Кейстутавіча.

У канцы 1432 г. жонка Свідрыгайлы была ўзята ў палон Жыгімонтам Кейстутавічам, дзе ў хуткім часе нарадзіла сына. Імя сына невядома, як і невядома ці былі яшчэ нашчадкі ў Свідрыгайлы. У 1434 г. Ганна была вызвалена з палону, а яе сын хутчэй за ўсё не выжыў, бо ў крыніцах ён больш не ўзгадваецца [6, с. 159-160]. Свідрыгайла памёр 10 лютага 1452 г., а княжна Ганна скончыла сваё жыццё ў перыядзе паміж 1471 г. і 30 ліпенем 1486 г.

Характарызуючы мэты заключанага шлюбу, трэба ўлічваць і палітычнае становішча, якое існавала на той час у Вялікім Княстве



This document has been edited with Infix PDF Editor
- free for non-commercial use.
To remove this notice, visit:
www.iceni.com/unlock.htm

Літоўскім. Шлюб Свідрыгайлы з цвярской княжной Ганнай адбыўся амаль адразу пасля смерці вялікага князя літоўскага Вітаўта (1392–1430 гг.) і ўступлення на гэтую пасаду Свідрыгайлы. Такім чынам, праз дадзены шлюб ён імкнуўся ўмацаваць сваё становішча, як кіраўніка дзяржавы, і заручыцца падтрымкай саюзнікаў. Такім чынам, шлюб Свідрыгайлы і Ганны меў свой палітычны разлік у выглядзе пошуку саюзнікаў.

Такім чынам, вялікія князі літоўскія і цвярскія князі сфармавалі блок, які на працягу больш чым стагоддзя змагаўся супраць панавання Маскоўскага княства на землях Русі. Цвярскія князі супрацьстаялі маскоўскім у праве на ўладзімірскае княжанне. Адпаведна, Вялікае Княства Літоўскае магло абапірацца на Цвер у сваёй барацьбе з Масквой за валоданне "рускімі землямі". Адным з важнейшых сродкаў забеспячэння трывалага саюза з Цвярскім княствам стала заключэнне дынастычных шлюбаў. Шлюбы былі неад'емным элементам стратэгіі Гедымінавічаў па распаўсюджванні сваіх уплываў у Паўночна-Усходняй Русі. Пачатак такой традыцыі быў пакладзены вялікім князем літоўскім Гедымінам, які зімой 1319–1320 гг. ажаніў сваю дачку Марыю з Дзмітрыем Міхайлавічам Грозныя Вочы. Дынастычныя сувязі з Цвер'ю актыўна падтрымліваў і Альгерд. Пэўны ўплыў на рэалізацыю падобнай шлюбнай стратэгіі аказвалі таксама Кейстут і Ульяна Цвярская. Саюз гэтых дзяржаў пратрымаўся даволі працяглы час. Аднак у канцы XIV–пачатку XV ст. актыўныя дынастычныя сувязі Вільні з вялікімі князямі цвярскімі сталі затухаць. У выніку, у канцы XV ст. землі Цвярскога княства ўвайшлі ў склад Маскоўскай дзяржавы. Шлюбныя стратэгіі вялікіх князёў літоўскіх у адносінах да Цвяры яскрава адлюстроўваюць актыўную ўсходнюю палітыку Вялікага Княства Літоўскага ў XIV ст. і паступовую страту ім ініцыятывы на гэтым накірунку знешнепалітычнай дзейнасці з другой трэці XV ст.

**Літаратура**

1. Краўцэвіч, А. К. Гедымін (1316—1341). Каралеўства Літвы і Русі Hiedymin (1316—1341). Kingdom of Lithuania and Ruthenia: нарыс / А. Краўцэвіч; [пад агульнай рэдакцыяй М. Скобы; пераклад на англійскую



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

мову А. Бурсава; мастак І. Гардзiёнак]. - Мінск : С. Ю. Татарнікава, 2012. - 146, [5] с.
2. Краўцэвіч, А. К. Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. Ад пачатку гаспадарства да каралеўства Літвы і Русі (1248—1341 г.) / А. Краўцэвіч; [навуковы рэдактар В. Голубеў]. - Гародня [Гродна]. - Уроцлаў [Вроцлаў] : Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego we Wrocławiu, 2013. - 184, [1] с.
3. Клюг Э. Княжество Тверское (1247—1485 гг.). Тверь, 1994. – 432 с.
4. Новосельский, В.В. История Великого княжества Литовского от рождения до Люблинской унии (1237—1569), или 333 года борьбы за возвышение и выживание. Великий князь Гедимин (1316—1341) / В. В. Новосельский. - Минск : Элайда, 2012. - 213, [1] с.
5. Полехов С.В., Браки князя Свидригайла Ольгердовича // По любви, въ правду, безо всякие хитрости. Друзья и коллеги к 80-летию В.А. Кучкина. Сб. ст. Москва, 2014 – с. 235-268
6. Tęgowski J. Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów / pod redakcją Marka Górnego. – Poznań-Wrocław, 1999 – T. 2. – 320 s.
7. Wolff J. Ród Gedimina. Dodatki i poprawki do dzieł K. Stadnickiego: „Synowie Gedymina”, „Olgierd i Kiejstut” i „Bracia Władysława Jagiełły”. – Kraków, 1886 – 325 s.

Лянцэвіч В. М.
МІУ (Мінск)

**Дзяржаўнае рэгуляванне гарадской гаспадаркі на беларускіх землях у XIV – XVI стст.**

Эпоха Вялікага княства Літоўскага адыграла вырашальную ролю ў фарміраванні беларускага горада, усталаванні яго не толькі як адміністрацыйнага, палітычнага, ваеннага і культурнага цэнтра, але, перш за ўсё, як цэнтра эканамічнага, дзе ажыццяўляецца актыўнае развіццё гандлёвых адносін і рамеснай вытворчасці. Беларускі горад феадальнай эпохі – гэта часцей за ўсё невялікае паселішча з насельніцтвам у 1,5 – 3 тыс. жыхароў. Буйнейшыя, насельніцтва якіх налічвала 10 і больш тыс. чал., сустракаліся вельмі рэдка. Грамата вялікага князя Казіміра ў 1449 г. пералічвала ў дзяржаве 15 “лепшых”



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm